11. Беларусь непокоренная (воспоминания, документы, хроника партизанского движения и подпольной борьбы 1941–1944 гг.) / В. В. Абатуров [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 392 с.
12. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн. Кн. 1 / Ин-т истории НАН Беларуси.; редкол.; А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – 480 с.
13. Список Героев Советского Союза, партизан и партизанок Белоруссии // НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 3. Д. 186. Л. 31–35.
14. Навечно в памяти народной: справочник / гл. ред. И. П. Шамякин. – 3-е изд. доп. и испр. – Минск : Бел. Сов. энцикл., 1984. – 607 с.
15. *Свекла, В. И.* Герои Советского Союза – белорусы и уроженцы Беларуси на фронтах Великой Отечественной войны / В. И. Свекла // «Этот день мы приближали, как могли» ... : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию Победы в Великой Отечественной войне, 7 мая 2015 г. – Минск: НАН Беларуси.

**А. А. Крыварот**

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ І ЛАТВІІ: АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ САВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ

Станаўленне савецкага партызанскага руху на паўночным захадзе Віцебшчыны і ў суседніх уездах Латвіі было непарыўна звязана з узаемадзеяннем беларускіх і латышскіх падпольшчыкаў і партызан. Гісторыя сумеснага змагання савецкіх патрыётаў супраць германскіх акупантаў у 1941–1944 гг. знайшла сваё адлюстраванне ў публікацыях, якія прадстаўлены рознымі літаратурнымі жанрамі. Найбольш поўна інфармацыя аб баявой садружнасці савецкіх партызан суседніх рэспублік пададзена ў калектыўных выданнях і навуковых артыкулах савецкага часу.

Звесткі аб узаемадзеянні беларускіх і латышскіх партызан сталі з'яўляцца ў публікацыях ужо першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. У другім томе кнігі «Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков» (1951), напісанай групай аўтараў, у асноўным работнікамі НКДБ БССР, з прыцягненнем архіўных матэрыялаў змешчаны эпізод аб тым, што латышскі атрад падчас гітлераўскай карнай экспедыцыі пад кодавай назвай «Зімовае чараўніцтва» разам з беларускімі партызанскімі фарміраваннямі 11–12 сакавіка 1943 г. заняў абарону на рацэ Свольна [1, с. 320].

Пік публікацый у рэспубліканскім друку з інфармацыяй па акрэсленай праблеме прыпадае на 60-я –перш. пал. 80-х гг. XX стагоддзя, калі савецкія гісторыкі ў адпаведнасці з партыйнымі ўстаноўкамі актыўна распрацоўвалі партызанскую праблематыку, у тым ліку асвятлялі тэму баявой садружнасці савецкіх партызан. Павелічэнне ў згаданы перыяд дакументальных звестак аб узаемадзеянні партызанскіх фарміраванняў Беларусі і суседніх рэспублік

было звязана з адкрытай магчымасцю для даследчыкаў працаваць з архіўнымі фондамі. У якасці прыклада можна прывесці пачатак друкавання ў 1960-я гг. мнагатомнага зборніка дакументаў і матэрыялаў «Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944)». У першы том выдання (1967) уключаны дакумент з інфармацыяй, што ў пачатку лета 1942 г. у партызанскім атрадзе Асвейскага раёна пад камандаваннем І. К. Захарава была група партызанаў-латышоў колькасцю 32 чалавекі, і гэтае падраздзяленне 12 чэрвеня зрабіла налёт на аб'ект у Латвіі, а 14 чэрвеня прыняло бой з карнікамі ў раёне вёскі Лісна [2, с. 234]. У першай кнізе другога тома зборніка (1973) змешчаны два дакументы, дзе згадана аб баях беларускіх партызанскіх брыгад І. К. Захарава, Р. П. Герасімава, А. В. Раманава і інш. ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнем латышскіх партызан у лютым – сакавіку 1943 г. супраць карнай экспедыцыі, і паведамлялася, што 11–12 сакавіка 1943 г. беларускія партызанскія фарміраванні і латышскі атрад занялі абарону на левым беразе р. Свольна і ўпартым супраціўленнем спынілі далейшае прасоўванне акупантаў. Згадана, што баявыя аперацыі латышы праводзілі як з віцебскімі партызанамі, так і разам з падраздзяленнямі Вілейскай вобласці. Так, партызаны атрада імя М. І. Кутузава (камандзір П. І. Кляменценка) сумесна з кулямётным аддзяленнем латышскага атрада ў ноч з 13 на 14 чэрвеня 1943 г. правялі налёт на два гарнізоны акупантаў на тэрыторыі Латвіі, спалілі гэтыя апорныя пункты, захапілі палонных і трафеі, частка якіх была перададзена партызанам суседняй рэспублікі [3, с. 244, 420, 463–464]. У 2-ю кнігу другога тома (1978) уключаны толькі адзін эпізод садружнасці партызан суседніх рэспублік – партызанская брыгада І. К. Захарава дапамагала латышскай брыгадзе нарыхтоўваць хлеб у Асвейскім раёне на той тэрыторыі, дзе загінула ці адкуль было прымусова вывезена ў нямецкае рабства мясцовае насельніцтва [4, с. 130].

Пачаткам навуковага асэнсавання ў айчыннай гістарыяграфіі тэмы баявой садружнасці савецкіх партызан можна лічыць артыкулы Л. В. Аржаевай «Боевое содружество» (1972) і А. Д. Цітова «Боевое интернациональное братство» (1974), надрукаваныя ў часопісе «Коммунист Белоруссии». У публікацыі Л. В. Аржаевай упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ў якасці аднаго з прыкладаў баявога ўзаемадзеяння беларускіх і латышскіх партызан названа сумесная атака на валасны цэнтр у мястэчку Вецслабада на тэрыторыі Латвіі і паказаны вынікі гэтай аперацыі. Аўтар пералічыла, праўда, без спасылак на канкрэтныя факты, такія формы сумеснай дзейнасці падпольшчыкаў Асвейскага раёна Беларусі і Луздзенскага ўезда Латвіі, як дапамога параненым у баях ваеннаслужачым-акружэнцам, перапраўка іх у партызанскія атрады, абмен разведінфармацыяй аб гарнізонах праціўніка, дыверсіі. У агульным плане згадана аб сумесным удзеле беларускіх і латышскіх партызан у стварэнні на стыку Беларусі, Расіі і Латвіі Брацкага партызанскага краю [5, с. 35]. У артыкуле А. Д. Цітова адзначана, што ўзаемадзеянне партызанскіх сіл савецкіх рэспублік ажыццяўлялася на розных

узроўнях, у тым ліку на ўзроўні цэнтральных і абласных камітэтаў партыі, штабоў партызанскага руху з мэтай узгаднення найбольш важных пытанняў усенароднай барацьбы супраць акупантаў, аказання ўзаемнай дапамогі і падтрымкі. Як імкненне дапамагчы ў разгортванні партызанскага руху на тэрыторыі Латвіі пададзена тэлеграма Паўночна-Заходняй групы ЦК КП(б)Б на адрас П. К. Панамарэнкі з інфармацыяй аб тым, што ў Асвейскі атрад І. К. Захарава ўлілося падраздзяленне латышскіх партызан. Таму прыезд у Асвейскі раён аднаго з прадстаўнікоў ЦК КП(б) Латвіі дае магчымаць разгарнуць вялікую работу і арганізаваць правод арганізатараў партызанскага руху і невялікіх груп. У артыкуле ўказана, што пазней гэту прапанову ажыццявілі і ў асвейскіх лясах, дзе была створана трывалая база для работы аператыўнай групы ЦК КП(б) Латвіі, што і адыграла вялікую ролю ў развіцці партызанскага руху на тэрыторыі суседняй рэспублікі. Аўтар адзначаў, што баявое ўзаемадзеянне беларускіх і латышскіх партызан характарызавалася шэрагам смелых аперацый, але гэта сцвярджэнне падмацаваў толькі агульнай інфармацыяй аб іх сумесным змаганні з карнымі экспедыцыямі ў лютым – сакавіку 1943 г. [6, с. 46–48, 51].

Першая спроба абагульнення матэрыялаў аб садружнасці партызанскіх фарміраванняў Беларусі і суседніх савецкіх рэспублік была часткова ажыццёўлена ў асобным раздзеле чацвёртага тома «Гісторыя Беларускай ССР» (1975). Сярод змешчанай інфармацыі ёсць звесткі і пра баявую садружнасць партызан Беларусі і Латвіі, якія ахопліваюць падзеі канца 1941– пачатку 1943 года. Разам з ужо вядомымі баявымі эпізодамі (удар па гарнізону ў валасным цэнтры Шкаўне і бой з карнікамі каля в. Лісна) змешчаны і новыя факты. Так, названы прыкладны пачатак узаемадзеяння савецкіх патрыятычных груп Віцебшчыны і Латвіі, паведамлена аб прыбыцці ў снежні 1942 г. на тэрыторыю Асвейскага раёна добра ўзброенага латышскага атрада пад камандаваннем В. П. Самсона. Адзначана, што латышскае падраздзяленне і беларускія партызаны правялі разам некалькі баявых аперацый і паспяхова дзейнічалі супраць карных экспедыцый. Пры гэтым у якасці прыклада падаецца толькі першы рэйд латышскага атрада на тэрыторыю Латвіі, у выніку якога сумесна з беларускімі партызанамі быў разгромлены добра ўмацаваны гарнізон акупантаў у Вецслабадзе, што выклікала ўзмацненне барацьбы латышскіх партыётаў супраць германскіх захопнікаў. Пэўную цікавасць уяўляе інфармацыя аб пачатку разгортвання дзейнасці на тэрыторыі Асвейскага раёна аператыўнай групы ЦК КП(б) Латвіі на чале з К. М. Озалінем, якая кантактавала з Віцебскім абкамам КПБ, і кіравала партызанскім рухам на тэрыторыі прыбалтыйскай рэспублікі [7, с. 446–447].

Некалькі фрагментаў баявога супрацоўніцтва партызан Беларусі і Латвіі змешчаны ў калектыўнай працы «Без линии фронта» (1979), падрыхтаванай работнікамі Віцебскага абкама КПБ ваеннага часу. У публікацыі ўказана, што вынікам агульных намаганняў беларускіх, латышскіх і калінінскіх партызан стала стварэнне Брацкага партызанскага краю, паўднёвая частка якога (Расонскі і Асвейскі раёны) служыла моцнай базай для партызан Беларусі,

Латвіі і Калінінскай вобласці, местам знаходжання аператыўнай групы ЦК КП(б) Латвіі. Згадваючы пра ўзаемадзеянне беларускіх і латышскіх партызан, аўтары прыводзяць у якасці прыкладаў толькі іх сумесныя дзеянні пры абароне Расонска-Асвейскай зоны ад дзвюх карных экспедыцый германскіх акупантаў і іх памагатых зімой – вясной 1943 г. Так, латышскі атрад В. П. Самсона разам з беларускімі брыгадамі складаў партызанскую групоўку падчас карнай акцыі «Заяц-бяляк». Хаця аб ўзаемадзеянні пры адбіцці наступнай карнай экспедыцыі «Зімовае чараўніцтва» звестак няшмат, аднак яны ўтрымліваюць новую інфармацыю. У адным з фрагментаў адзначаецца, што кіраўнік аператыўнай групы ЦК КП(б) Латвіі К. М. Озалінь 26 лютага 1943 г. на нарадзе партыйных работнікаў і камандна-палітычнага складу партызанскіх фарміраванняў Расонска-Асвейскай зоны быў уключаны ў склад аператыўнай групы па каардынацыі дзейнасці партызанскіх сіл. У другім фрагменце паведамляецца, што латышская брыгада пад камандаваннем В. Я. Лайвінша разам з пяццю атрадамі Расонскай брыгады і трыма брыгадамі Калінінскай вобласці ўваходзіла ў слад групоўкі пад камандаваннем А. М. Гаўрылава і абаранялася на поўначы Расонска-Асвейскай партызанскай зоны [8, с. 272–273, 276].

У адным з раздзелаў манаграфіі беларускіх гісторыкаў А. Ф. Хацкевіча і Р. Р. Кручка «Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР» (1980) змешчаны матэрыял, прысвечаны баявой садружнасці савецкіх партызан Беларусі і Латвіі. Яго храналагічныя рамкі ахопліваюць перыяд лета 1941– вясна 1942 г. Асноўны пласт інфармацыі датычыцца кантактаў падпольных груп пад кіраўніцтвам В. Прошкі Асвейскага раёна і А. М. Грома Луздзенскага ўезда Латвіі, якія ўстанавіліся ў снежні 1941 г. Падкрэслена, што гэта была сумесная дзейнасць па сутнасці ў адзінай інтэрнацыянальнай арганізацыі. Хаця неабходна ўлічваць, што пераход з адной рэспублікі ў другую быў вельмі складаны, бо германскае камандаванне ўсталявала паміж імі дзяржаўную мяжу. У манаграфіі адной з форм узаемадзеяння падпольшчыкаў вясной 1942 г. названа іх дапамога савецкім ваеннаслужачым-акружэнцам у стварэнні ўзброеных груп і перамяшчэнні ў лясы Беларусі. На думку аўтараў, умацаванню сувязей савецкіх патрыётаў Латвіі і Беларусі садзейнічала ўваходжанне падпольнай групы А. М. Грома колькасцю 28 чалавек у Асвейскі партызанскі атрад пад камандаваннем І. К. Захарава. Адзначана, што падраздзяленне, у якім латышы да лета 1942 г. складалі палову асабовага складу, актыўна дзейнічала на тэрыторыі Асвейскага раёна, рабіла налёты на варожыя гарнізоны ў Латвіі. Пры гэтым у кнізе не прадстаўлены прыклады такіх аперацый [9, с. 254–255].

Новая інфармацыя па акрэсленай праблеме ў артыкуле А. М. Мацко «Баявое братство партизан» (1982 г.) датычыцца паказу сумеснага паспяховага налёту ў студзені 1943 г. беларускіх, рускіх і латышскіх партызан на восем гарнізонаў, размешчаных на чыгуначным участку Боркавічы – Дрыса, і паведамлення аб нанясенні ворагу адчувальнага ўрону. Аўтар таксама ўключыў ужо вядомы матэрыял аб стварэнні партызанамі Беларусі, Латвіі

і Калінінскай вобласці Брацкага партызанскага краю, які ахарактарызаваны як плацдарм для нападу на апорныя пункты ворага і яго камунікацыі для зрыву эканамічных і палітычных мерапрыемстваў гітлераўскага камандавання [10, с. 51–53].

У айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду найбольш поўна звесткі аб узаемадзеянні беларускіх і латышскіх партызан прадстаўлены у трохтомным калектыўным выданні «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» (1983–1985). У першым томе кнігі змешчаны ўжо вядомы матэрыял аб кантактах падпольшчыкаў Асвейскага раёна і савецкіх патрыётаў з памежных населеных пунктаў Латвіі і фрагмент з указаннем колькасці латышоў у атрадзе імя М. В. Фрунзе па стане на ліпень 1942 г. Падкрэслена, што асаблівасцю Расонска-Асвейскай зоны было тое, што яна прымыкала да межаў Расійскай Федэрацыі і Латвіі, стваралася ў цесным узаемадзеянні партызан трох рэспублік [11, с. 267, 332, 489]. У другі том выдання (1984) уключана значна больш інфармацыі, якая адлюстроўвае розныя формы ўзаемадзеяння беларускіх і латышскіх партызан з лістапада 1942 г. і да канца 1943 г. У дапоўненым выглядзе паказаны парадак падрыхтоўкі і правядзення нападу на гарнізон праціўніка ў Вецслабадзе. Усе астатнія звесткі датычацца паказу сумесных баёў з карнікамі. У тэксце ўпершыню змешчаны фрагмент аб баявых дзеяннях беларускіх, латышскіх і літоўскіх партызан супраць карнай акцыі «Нюрнберг» у лясах Мядзельскага раёна ў канцы лістапада 1942 г. Яшчэ чатыры эпізоды адносяцца да сумеснай абароны Расонска-Асвейскай зоны ў 1943 г. Упершыню згадваецца, што падчас карнай экспедыцыі «Заяц-бяляк» аўтаматчыкі латышскага атрада праявілі стойкасць у абароне каля вёсак Паўлава і Прохарава. Ужо вядомым з’яўляецца факт уваходжання прадстаўніка ЦК КП(б) Латвіі К. М. Азоліня ў аб’яднаны штаб па каардынацыі дзейнасці партызанскіх сіл супраць карнай экспедыцыі «Зімовае чараўніцтва». Да новага адносіцца матэрыял аб узаемадзеянні беларускіх і латышскіх партызан пры выхадзе з блакады ў час правядзення акупантамі карнай акцыі «Ота» ў трэцяй дэкадзе снежня 1943 г. У пэўнай частцы інфармацыі толькі ў агульным плане паведамляецца аб сумеснай барацьбе партызан Беларусі і Латвіі з карнікамі [12, с. 269, 283–284, 289, 291].

У раздзеле «Боевое содружество партизан братских республик» трэцяй кнігі (1985) увесь матэрыял па праблеме можна прадставіць дзвюма групамі. Да першай групы адносяцца звесткі аб узаемадзеянні беларускіх і латышскіх партызан з калінінскімі брыгадамі ў межах Брацкага партызанскага краю і Расонска-Асвейскай зоны. Адзначана, што падчас карных экспедыцый «Заяц-бяляк», «Зімовае чараўніцтва», «Генрых» і «Ота» аб’яднаныя сілы партызан трох брацкіх рэспублік сваімі актыўнымі дзеяннямі прымусілі праціўніка адыходзіць з тэрыторыі краю. Калі ў адносінах да першых дзвюх акцый з гэтым можна пагадзіцца, то барацьба з карнікамі ў лістападзе – снежні 1943 г. мела для партызан вельмі цяжкія наступствы, бо да канца года Брацкі партызанскі край і Расонска-Асвейская зона фактычна спынілі сваё

існаванне. Больш-менш падрабязна адлюстравана толькі сумесная барацьба партызан Беларусі і Латвіі супраць карнай акцыі «Заяц-бяляк». У раздзеле памылкова згадана, што наступленне карнікаў з боку Латвіі было разгорнута ў сакавіку – красівіку 1943 г. На самой справе гэта адбывалася ў лютым – сакавіку 1943 г. Дапушчана недакладнасць і ў пераліку складу аб'яднанага камандавання сіламі партызан падчас карнай экспедыцыі «Зімовае чараўніцтва». Замест яго названы склад каардынацыйнага штаба [13, с. 347–349]. У другой групе матэрыялаў па праблеме садружнасці падпольшчыкаў і партызан Беларусі і Латвіі ёсць звесткі аб непасрэдным іх арганізацыйным і баявым узаемадзеянні, якое адбывался на памежжы дзвюх рэспублік. Да новай інфармацыі неабходна аднесці ўключаныя ў тэкст факты дапамогі беларускіх партызанскіх фарміраванняў латышскім дыверсійным групам восенню 1942 г. у разгортванні латышскага атрада ў брыгаду, а таксама сумеснага налёту на ксаверынскі гарнізон праціўніка на тэрыторыі Латвіі [13, с. 363–366].

Змешчаны ў беларускай гістарыяграфіі савецкага перыяду матэрыял аб баявой садружнасці падпольшчыкаў і партызан Беларусі і Латвіі служыць пэўнай базай для далейшага даследавання праблемы ўзаемадзеяння савецкіх патрыятычных сіл на беларуска-латвійскім памежжы ў 1941–1944 гг.

## ЛІТАРАТУРА

1. Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков: в 2 ч. – Минск : Госиздат, 1949–1951. – Ч. 2. Мощный рост партизанского движения. – 1951. – 1034 с.

2. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 1 : Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – 1967. – 744 с.

3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 2: Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны. – Кн. 1. (ноябрь 1942 – июнь 1943) / сост. Г. Н. Шевела [и др.]. – Минск, 1973. – 680 с.

4. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 2: Развитие всенародного партизанского движения в Белоруссии на втором этапе войны. – Кн. 2. (июль – декабрь 1943) / Г. Н. Шевела [и др.]. – Минск, 1978. – 814 с.

5. *Аржаева, Л.* Боевое содружество / Л. Аржаева // Коммунист Белоруссии. – 1972. – № 6. – С. 34–38.

6. *Титов, А.* Боевое интернациональное братство / А. Титов // Коммунист Белоруссии. – 1974. – № 3. – С. 45–52.

7. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – 1975. – 640 с.
8. *Жилянин, Я. А.* Без линии фронта / Я. А. Жилянин, И. Б. Позняков, В. И. Лузгин. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Беларусь, 1979. – 382 с.
9. *Хацкевич, А. Ф.* Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР / А. Ф. Хацкевич, Р. Р. Крючок. – Минск : Наука и техника, 1980. – 320 с.
10. *Мацко, А.* Боевое братство партизан / А. Мацко // Коммунист Белоруссии. – 1982. – № 9. – С. 46–53.
11. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т., 1983–1985. – Т. 1. – 1983. –591 с.
12. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т., 1983–1985. – Т. 2 – 1984. – 551 с.
13. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 3 / Л. В. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. Н. Мацко [и др.]. – 1985. – 531 с.

**Л. А. Осіпава, Г. С. Хадасевіч**

## ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ ПІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

1941–1944 гг. – вызначальныя гады ў гісторыі Беларусі XX ст. Вялікая Айчынная вайна прынесла шмат страт і пакут беларускай зямлі. Вайна закранула кожную беларускую сям'ю, але беларускі народ здолеў выстаяць і арганізаваць дастойны адпор ворагу. Насельніцтва гарадоў і вёсак стварала партызанскія і падпольныя атрады. Адным з першых куткоў Беларусі, дзе узнік партызанскі рух, быў Пінскі раён.

Падрыхтоўка да партызанскай вайны на Беларусі на выпадак вайны з нацысцкай Германіяй ці Польшчай пачалася яшчэ ў 1930-я гг. Згодна з загадамі савецкага Генштаба стваралася законспіраваная сетка дыверсійных груп і адзіночак у гарадах і на чыгунках, арганізоўваліся манеўраныя партызанскія атрады, ствараліся базы забеспячэння ўсім неабходным. Так, у схронах былі закладзены боепрыпасы, амуніцыя, шмат харчавання, каля 50 тыс. вінтовак, 150 кулямётаў, узрыўчатка. Кіравалі гэтай работай партыйныя органы і камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі І. П. Убарэвіч. Усяго было створана 6 тэрытарыяльных партызанскіх атрадаў – Бабруйскі, Барысаўскі, Мінскі, Мазырскі, Полацкі і Слуцкі, у складзе 300–500 прафесіяналаў, якія прайшлі абучэнне ў спецыяльных закрытых школах. На чале атрадаў стаялі вопытныя кіраўнікі – удзельнікі партызанкі ў гады першай сусветнай і антыпольскай барацьбы пачатку 1920-х гг.: С. А. Ваўпшасаў,